**Бундэстаг Нямеччыны** **Дакумент Бундэстагу 20/9146**
**20- га склікання** 7.11.2023

# Хадайніцтва

**фракцыі СДПГ, САЮЗ 90/ЗЯЛЁНЫЯ і СвДП**

## За дэмакратычную Беларусь у еўрапейскай сям'і

Нямецкі Бундэстаг мае намер прыняць рашэнне:

I. Нямецкі Бундэстаг заяўляе:

Бундэстаг рашуча стаіць на баку ўсіх людзей, якія выступаюць за дэмакратыю і правы чалавека, свабоду, самавызначэнне і справядлівыя выбары ў Беларусі. Наша салідарнасць з беларускім дэмакратычным рухам застаецца непарушнай. Дэпутаты Бундэстагу ставяцца з павагай і падтрымліваюць шматлікіх беларускіх змагароў за свабоду, якія асабіста плацяць вельмі высокую цану за мэту дасягнення дэмакратычнай Беларусі.

Нямецкі Бундэстаг памятае ахвяр беларускага рэжыму, якія загінулі падчас пратэстаў пасля фальсіфікаваных прэзідэнцкіх выбараў летам 2020 года праз ужыванне дзяржаўнага гвалту або як палітвязні ў беларускіх турмах у нечалавечых умовах. Выказваем шчырыя спачуванні сем'ям загінуўшых. Дэпутаты Бундэстагу ўсведамляюць глыбокі боль, які церпяць многія беларусы ад рук рэжыму.

Нямецкі Бундэстаг выказвае салідарнасць з усімі палітвязнямі ў Беларусі. Іх вызваленне мае найвышэйшы прыярытэт. Імкненне да свабоды, чалавечай годнасці і дэмакратыі - гэта не злачынства, а права чалавека. Узяўшы патранаж над больш за 100 палітзняволенымі, дэпутаты Нямецкага Бундэстагу дапамагаюць пастаянна прыцягваць увагу да жахлівага становішча палітычных зняволеных і не даць пра іх забыць. З заснаваннем «Групы сяброў дэмакратычнай Беларусі» у Бундэстагу быў створаны форум для рэгулярнага абмену з беларускім дэмакратычным рухам пра будучыню краіны.

Гісторыя і роля Нямеччыны ў Еўропе абавязваюць нас падтрымліваць рух за дэмакратыю і свабоду на нашым кантыненце па меры нашых сіл і магчымасцяў. З агрэсіўнай вайной Расіі супраць Украіны, якая парушае міжнароднае права, зноў стала відавочным, што аўтакратычныя рэжымы ўяўляюць непасрэдную пагрозу міру, бяспецы і стабільнасці нашага заснаванага на пэўных правілах еўрапейскага мірнага парадку. Таму таксама мы асабіста зацікаўлены ва ўмацаванні дэмакратычных сіл у нашым еўрапейскім суседстве.

II. Бундэстаг Нямеччыны адзначае:

Прэзідэнцкія выбары ў Беларусі 9 жніўня 2020 года былі масава сфальсіфікаваныя. Яны не былі ані свабоднымі, ані справядлівымі і ніякім чынам не адпавядалі стандартам дэмакратычных выбараў. Напярэдадні дыктатар Лукашэнка свядома сарваў міжнароднае назіранне за выбарамі з боку АБСЕ. Ніякай легітымнасці пасля гэтых выбараў Аляксандр Лукашэнка не атрымаў. Краіны Еўразвязу па праву не прызналі вынікаў выбараў.

З лета 2020 года беларускі рэжым ажыццяўляе беспрэцэдэнтную хвалю рэпрэсій супраць насельніцтва. Мірныя пратэсты ў сувязі з фальсіфікаванымі прэзідэнцкімі выбарамі былі жорстка задушаны. Дзясяткі тысяч былі безпадстаўна арыштаваныя, а тысячы – асуджаныя на паказальных працэсах. Арганізацыі грамадзянскай супольнасці і незалежныя прафсаюзы былі гвалтоўна распушчаны, незалежныя СМІ, як і нацыянальныя і міжнародныя культурныя ўстановы былі зачынены. Дзейнасць у галіне правоў чалавека і дэмакратыі была крыміналізавана, адвакатаў пазбавілі ліцэнзій, а сфера прымянення смяротнага пакарання была вельмі значна пашырана. Свабода сходаў і права на свабоду выказвання на практыцы не існуюць.

Прадстаўнікі беларускага дэмакратычнага руху знаходзяцца ў вымушанай эміграцыі або ў турмах. Людзі па-ранейшаму амаль штодня трапляюць за краты па палітычных матывах. Паводле ацэнак, колькасць палітвязняў зараз складае каля 1500 чалавек. Насамрэч іх колькасць, верагодна, значна большая. Лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру Алесь Бяляцкі асуджаны да дзесяці гадоў пазбаўлення волі, не дапушчаныя да выбараў апазіцыйныя кандыдаты ў прэзідэнты Сяргей Ціханоўскі і Віктар Бабарыка – да 18 і 14 гадоў адпаведна, адна з выбітных апазіцыянерак Марыя Калеснікава – да адзінаццаці гадоў пазбаўлення волі.

Умовы ўтрымання ў беларускіх турмах і папраўчых калоніях бесчалавечныя: здзекі і катаванні, у тым ліку сексуальны гвалт, а таксама тыдні адзіночнага зняволення ў малюсенькіх камерах без матрацаў, коўдраў, кніг і кантактаў з сям'ёй і сябрамі гэта - жорсткая штодзённасць для многіх вязняў. Нават дзяцей часта не пускаюць да маці і таты. Медычная дапамога не аказваецца ў неабходным аб'ёме. Многія палітвязні ўжо загінулі ад такіх нечалавечых умовах зняволення. Спробы суіцыду адбываюцца зноў і зноў. Нярэдкія выпадкі, калі ад людзей у турмах месяцамі няма ніякіх прыкмет жыцця, - гэта штодзённы жах для родных і блізкіх. Сваякам зняволеных часта пагражаюць і на іх аказваюць ціск.

Справаздача Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека ў лютым 2023 года пацвердзіла сістэматычныя, шырока распаўсюджаныя і сур'ёзныя парушэнні правоў чалавека ў Беларусі, некаторыя з якіх могуць з’яўляцца злачынствамі супраць чалавечнасці. Акрамя таго, у справаздачы Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (АБСЕ), чальцом якой з'яўляецца Беларусь, на травень 2023 г. зроблена выснова, што беларускі рэжым парушае шматлікія абавязкі ў галіне правоў чалавека ў рамках гуманітарнага вымярэння АБСЕ і стварыў арсенал больш строгіх прававых захадаў і ўнёс папраўкі ў канстытуцыю для перадухілення існавання любой формы апазіцыі.

Летам 2020 года Аляксандр Лукашэнка і яго рэжым прынялі рашэнне, адказнасць за якое нясуць толькі яны. Яны гвалтоўна паставілі ўтрыманне ўласнай улады вышэй за волю беларусаў і будучыню краіны. Замест таго,

каб распачаць дэмакратычнае адкрыццё краіны, рэжым Лукашэнкі свядома завёў Беларусь у ізаляцыю і, тым самым, зрабіў яе яшчэ больш палітычна, эканамічна і фінансава залежнай ад Крамля.

Беларусь з'яўляецца базай і плацдармам расійскага войска ў агрэсіўнай вайне супраць Украіны, што парушае міжнароднае права: 24 лютага 2022 г. расійскія войскі атакавалі Украіну з тэрыторыі Беларусі. Расійскія ракеты неаднаразова запускаліся з Беларусі па тэрыторыі Украіны. Заяўленае размяшчэнне тактычнай ядзернай зброі паказвае, наколькі моцна дыктатар Лукашэнка працягвае рабіць сябе памагатым Уладзіміра Пуціна. Акрамя таго даказана, што беларускі рэжым быў саўдзельнікам аднаго з самых жахлівых ваенных злачынстваў Расіі – дэпартацыі ўкраінскіх дзяцей.

Сярод беларускага насельніцтва няма большасці падтрымкі расійскай агрэсіўнай вайны. Пра тое, што існуе і актыўны супраціў дзеянням рэжыму, сведчаць, напрыклад, асобныя мужныя акцыі з мэтай сабатажу шляхоў забеспячэння расійскай арміі. Таксама ва ўкраінскім войску ваюе шмат беларускіх добраахвотнікаў. Яны перакананыя, што вольная Беларусь магчымая толькі пры вольнай Украіне. Дэмакратычныя сілы Беларусі ў эміграцыі выказвалі салідарнасць з украінцамі.

Гэтая салідарнасць і нястомныя намаганні дэмакратычнай грамадзянскай супольнасці і «Аб'яднанага пераходнага кабінета», якія стаяць у апазіцыі да дыктатара Лукашэнкі, ясна паказваюць, што альтэрнатыва дыктатарскаму рэжыму ў Беларусі магчымая і што моцнае і разнастайнае беларускае грамадства не можа быць прыраўняна рэжыму. Нямецкі Бундэстаг цвёрда стаіць на баку ўсяго беларускага дэмакратычнага руху, Святланы Ціханоўскай і ўзначаленага ёю «Аб'яднанага пераходнага кабінета». Дэпутаты Бундэстагу ўдзячныя за іх мужнасць, сілу, стойкасць і барацьбу за еўрапейскія каштоўнасці.

Еўрапейскі Звяз стаў найбуйнейшым прытулкам для беларускага дэмакратычнага руху ў выгнанні. Перш за ўсё Літва і Польшча заслугоўваюць вялікага прызнання за іх узорную хуткасць, не бюракратычную і ўсебаковую гатоўнасць дапамагчы. Еўразвяз і беларускі дэмакратычны рух аб’ядноўваюць адзіныя каштоўнасці: павага да чалавечай годнасці, свабода, дэмакратыя і вяршэнства права. Усе беларусы павінны ведаць, што ў перспектыве свабодную і дэмакратычную Беларусь будуць вітаць у сям’і еўрапейскіх дзяржаваў.

III. Нямецкі Бундэстаг самым рашучым чынам асуджае

- агрэсіўную вайну Расіі супраць Украіны, якая парушае міжнароднае права, і падтрымку беларускім рэжымам гэтага абуральнага невыканання міжнароднага права і звязаных з гэтым сур'ёзных парушэнняў міжнароднага гуманітарнага права;
- жорсткія дзеянні беларускага рэжыму супраць уласнага насельніцтва і бязлітасны пераслед беларускага дэмакратычнага руху;
- усе выпадкі забойстваў крытыкаў рэжыму, выкраданняў, палітычна матываваных арыштаў і прысудаў, катаванняў і сексуальнага гвалту;

- незаконнае зняволенне палітычных вязняў, мэтанакіраванае знішчэнне кола іхных родных і блізкіх, бесчалавечныя ўмовы ўтрымання ў турмах.

Бундэстаг заклікае беларускі рэжым спыніць усе рэпрэсіі, вызваліць усіх палітвязняў, зрабіць магчымымі свабодныя і справядлівыя выбары пад назіраннем АБСЕ і неадкладна спыніць падтрымку вайны супраць Украіны, якая парушае міжнароднае права.

IV. Нямецкі Бундэстаг вітае

- абмежавальныя меры, прынятыя дагэтуль супраць Беларусі на еўрапейскім узроўні, – як персанальныя санкцыі супраць дыктатара Лукашэнкі і частак беларускага рэпрэсіўнага апарату, так і сектаральныя эканамічныя санкцыі;
- створаную на ўзроўні ЕЗ кансультацыйную групу для супрацы з беларускім дэмакратычным рухам, а таксама рэсурсы, адведзеныя на падтрымку беларускай грамадзянскай супольнасці і незалежных СМІ;
- інвестыцыйны пакет, прапанаваны Еўрапейскім Звязам для забеспячэння эканамічнай падтрымкі дэмакратычнай Беларусі ў выпадку дэмакратычнага транзіту;
- далейшае развіццё прапановы асобнай лічбавай праграмы Deutsche Welle для Беларусі, якая была запушчана восенню 2020 года і з таго часу паспяхова дасягае людзей у Беларусі і ў выгнанні і прыцягвае іх да дыялогу;
- ранейшую і актуальную падтрымку беларускага дэмакратычнага руху з боку Федэральнага ўрада, у тым ліку праз
  - падтрымку праектаў грамадзянскай супольнасці ў рамках праграмы «Пашырэнне супрацоўніцтва з грамадзянскай супольнасцю ў краінах Усходняга партнёрства і Расіі», а таксама падтрымку свабодных прафсаюзаў;
  - уклад у Еўрапейскі фонд за дэмакратыю (European Endowment for Democracy);
  - падтрымку Міжнароднай платформы для Беларусі па прыцягненні вінаватых да адказнасці, мэта якой – збор і захаванне доказаў сур'ёзных парушэнняў правоў чалавека;
  - садзейнічанне медычнай і псіхалагічнай падтрымцы людзей, якія пацярпелі ад рэпрэсій;
  - разнастайныя праграмы стыпендый, якія таксама адкрыты для людзей з Беларусі, сярод якіх такія як Ініцыятыва Ханны Арэндт для дзеячаў СМІ ў выгнанні, Ініцыятыва Элізабэт Селберт для праваабаронцаў, Ініцыятыва Марціна Рота для творцаў мастацтва і культуры, Ініцыятыва Філіпа Шварца для даследчыкаў і праграма Гільде Домін для студэнтаў;
  - падтрымку Еўрапейскага фонду журналістыкі ў выгнанні (JX Fund) і, такім чынам, «Рэпарцёраў без межаў», Фонду Шёпфліна і Фонду Рудольфа Аўгштайна для падтрымкі

СМІ ў выгнанні і журналістаў у групе рызыкі, у тым ліку з Беларусі;

- падтрымку офісаў нямецкіх палітычных фондаў, якія падтрымліваюць кантакты з Беларуссю;
- падтрымку офіса экстранай дапамогі Science-at-Risk грамадскай арганізацыі Акадэмічнай сеткі Усходняй Еўропы для дапамогі палітычна пераследаваных навукоўцаў;
- працяг прыёму людзей з Беларусі, якія пераследуюцца па палітычных матывах, у адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 22 Закона аб прававым становішчы замежных грамадзян у Нямеччыне.

V. Нямецкі Бундэстаг заклікае Федэральны ўрад, выконваючы патрабаванні дзяржаўнага бюджэту,

- на еўрапейскім узроўні
  - працягваць выступаць за персанальныя санкцыі супраць беларускіх спецслужбаў, а таксама супраць усіх суддзяў, адказных за жорсткія прысуды палітвязням;
  - выступаць за далейшыя эканамічныя сектаральныя санкцыі, якія закранаюць структуры фінансавання беларускага рэжыму, эфектыўна закрываць любыя існуючыя шчыліны ў рэжыме санкцый, а ў выпадку дыскусіі аб змякчэнні санкцый, рашуча супрацьстаяць гэтаму, таму што адмена санкцыі прынцыпова магчымая толькі ў тым выпадку, калі больш не будуць існаваць сур'ёзныя і шматлікія прычыны, якія прывялі да ўвядзення санкцый;
  - спрыяць інтэнсіўнаму дыялогу ў рамках кансультацыйнай групы ЕЗ па супрацоўніцтву з дэмакратычнымі сіламі Беларусі з мэтай распрацоўкі сумесных стратэгій і атрымліваць магчымасць рэгулярна запытваць і адаптаваць патрэбы ў падтрымцы;
  - выступаць за інтэграцыю беларускай грамадзянскай супольнасці і дэмакратычных сіл у праграму ЕЗ «Усходняе партнёрства», якая зараз адаптуецца Еўрапейскай службай замежных спраў;
  - падрыхтоўвацца да будучыні Беларусі як свабоднай і дэмакратычнай краіны і падаваць сігнал, што дэмакратычную Беларусь вітаюць у еўрапейскай супольнасці каштоўнасцяў;
- выступаць за захаванне дзяржаўнага суверэнітэту, а таксама культуры і мовы Беларусі і даць адназначна зразумець Расіі, што паступовае паглынанне Беларусі, якое фарсуе Крэмль пры падтрымцы з боку Аляксандра Лукашэнкі, абсалютна непрымальнае і будзе адхілена самым рашучым чынам. Нашы ўсходнія суседзі ёсць і застаюцца незалежнымі і суверэннымі дзяржавамі, якія самі вырашаюць сваю будучыню і ніколі больш не павінны стаць аб'ектам імперыялістычных мараў і інтарэсаў;

- нясхільна выступаць за вызваленне ўсіх палітычных зняволеных, за правядзенне новых справядлівых і свабодных выбараў пад назіраннем АБСЕ і за неадкладнае спыненне гвалту і катаванняў;
- працягваць і пашыраць падтрымку дэмакратычных сілаў;
- аказваць пастаянную і ўзмоцненую падтрымку незалежным СМІ і журналістам-фрылансерам, праваабаронцам, навукоўцам, дзеячам культуры, прафесійным спартсменам у выгнанні, студэнтам і прафсаюзным актывістам, лічбавым грамадскім праектам і людзям, якія пацярпелі ад рэпрэсій.
  З гэтай мэтай варта выкарыстоўваць існуючыя праграмы фінансавання і стыпендый розных міністэрстваў і ведамстваў, але таксама трэба выкарыстоўваць альтэрнатыўныя магчымасці падтрымкі ў асобных выпадках або выдатных праектаў грамадзянскай супольнасці;
- працягваць прыём людзей з Беларусі, якія пераследуюцца па палітычных матывах, у адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 22 Закона аб прававым становішчы замежных грамадзян у Нямеччыне;
- аказваць узмоцненую і ўсебаковую падтрымку былым палітвязням пасля іх вызвалення. Калі яны працягваюць знаходзіцца ў небяспецы з нагоды пераследу з боку рэжыму Лукашэнкі, ім, сярод іншага, трэба дазволіць уезд у Нямеччыну ў адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 22 Закона аб прававым становішчы замежных грамадзян, а таксама прапанаваць медычную і псіхасацыяльную дапамогу. Сумесна з беларускай грамадзянскай супольнасцю трэба выпрацоўваць больш канкрэтныя ідэі, у тым ліку накіраваныя на магчымасці больш падтрымліваць сем'і палітвязняў;
- працягваць падтрымліваць збор доказаў найбольш сур'ёзных парушэнняў правоў чалавека і выступаць за тое, каб вінаватыя і палітычна адказныя былі прыцягнуты да адказнасці перад судом. Падтрымка беларускім рэжымам гвалтоўных дэпартацый украінскіх дзяцей у Расію і Беларусь таксама павінна быць расследавана ў судзе, каб вінаватыя ў гэтым панеслі адказнасць;
- працягваць падтрымку праектаў дэмакратычнай беларускай грамадзянскай супольнасці і ў будучыні ў рамках праграмы «Пашырэнне супрацоўніцтва з грамадзянскай супольнасцю ў краінах Усходняга партнёрства і Расіі». Прынамсі праекты беларускай дыяспары і грамадзянскай супольнасці ў выгнанні павінны па ранейшаму атрымліваць падтрымку;
- удасканаліць працэс падачы заявак і прыняцця рашэнняў па праграме «Пашырэння супрацоўніцтва з грамадзянскай супольнасцю ў краінах Усходняга партнёрства і Расіі», паміж іншага з накіраванасцю на тое, каб фінансаванне магло быць выплачана партнёрам з грамадзянскай супольнасці як мага раней з пачатку года, а ў асаблівых выпадках у сувязі з пэўнымі падзеямі каб існавала больш гнуткая магчымасць для падачы заявак на фінансаванне;
- працягваць падтрымліваць выдатную працу на карысць грамадзянскай супольнасці такіх грамадскіх арганізацый, як RAZAM e.V., Libereco - Partnership for Human Rights e.V. або бюро экстранай дапамогі Science-at-Risk Акадэмічнай сеткі Усходняй

Еўропы e.V. (AKNO), каб і ў будучыні існавалі кантактныя пункты ў Нямеччыне для людзей з Беларусі, якія пераследуюцца па палітычных матывах, і каб адлюстроўваць і даваць больш інфармацыі наконт сітуацыі ў Беларусі;

- даваць больш інфармацыі міністэрствам і адміністрацыям федэральных зямель, якія адказваюць за міграцыйныя права, аб бягучай сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі і ўказваць ім на розныя юрыдычна-прававыя варыянты знаходжання беларусаў у Нямеччыне ў рамках дзеючага заканадаўства, у першую чаргу для дзеячаў культуры і СМІ, якія крытыкуюць рэжым. Узорам для гэтага павінен стаць ліст Федэральнага міністэрства ўнутраных спраў ад 20 чэрвеня 2022 г. (M3AG-21000/33#14), у якім была прадстаўлена інфармацыя пра юрыдычна-прававыя варыянты знаходжання дзеячаў культуры і СМІ з Расіі ў Нямеччыне;

- дадаткова звяртаць увагу нямецкіх дыпламатычных прадстаўніцтваў у краінах па за межамі ЕЗ, такіх як Грузія ці Малдова, на магчымасці для беларусаў, якія падвяргаюцца палітычнаму пераследу, падаваць заяўкі на візы ў адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 22 Закона аб прававым становішчы замежных грамадзян у Нямеччыне;

- указваць на тое, што прымяненне артыкула 24 Закона аб прававым становішчы замежных грамадзян у Нямеччыне ў спалучэнні з пунктам 3 артыкула 2 Выканаўчага рашэння Рады (ЕЗ) 2022/382 ад 4 сакавіка 2022 г. аб «Вызначэнні наяўнасці масавага прытоку перамешчаных асоб з Украіны адпаведна артыкулу 5 Дырэктывы 2001/55/EG і ўвядзення іх часовай абароны» таксама павінна быць праверана ў выпадках грамадзян Беларусі, якія трапілі пад палітычны пераслед і якія знаходзіліся ва Украіне 24 лютага 2022 г. і скарысталіся магчымасцю знаходзіцца там без візы або атрымалі дазвол на часовае знаходжанне і якія не могуць бяспечна і доўгатэрмінова вярнуцца ў Беларусь;

- Выдаваць грамадзянам Беларусі, якія падвяргаюцца палітычнаму пераследу ў Беларусі, «праязныя дакументы для замежнікаў» згодна з Дырэктывай аб прававым становішчы замежных грамадзян. З лета 2020 г. яны ўжо не маглі магчымасці звяртацца ў амбасаду Беларусі ў Нямеччыне, бо гэта магло, з аднаго боку, зрабіць вядомым іхнае ўласнае знаходжанне, а з другога боку, падвергнуць небяспецы членаў іхных сям’яў у Беларусі. З указам дыктатара Лукашэнкі ад 7 верасня 2023 г. аб спыненні, паміж іншага, выдачы пашпартоў беларусам, якія жывуць за мяжой, у дыпламатычных прадстаўніцтвах, сітуацыя беларусаў у выгнанні значна пагоршылася, таму ў Нямеччыне і ва ўсім ЕЗ неабходна як мага хутчэй знайсці вырашэнне гэтага пытання.

Берлін, 7.11.2023 г.

**Д-р Рольф Мюцеціх і фракцыя**
**Катарына Дрёге, Брыта Хасельман і фракцыя**
**Крысціян Дюр і фракцыя**